Надвор'е

А НА ДВАРЭ АМАЛЬ ШТО ШТОРМ

Але ўжо ў панядзелак зноў моцны снег, а ў сераду — да 18 марозу

Вось такія нас чакаюць выпрабаванні, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У пятніцу надвор'е ў нашай краіне будуць вызначаць франтальныя раздзелы ад цыклону з цэнтрам над Эстоніяй, а ў другой палове дня адаб'ецца ўплыў няўстойлівай паветранай масы.

У суботу ўмовы надвор'я ў Беларусі будуць фарміраваць атмасферныя франты і халаднаватыя няўстойлівыя паветраныя масы, якія паступаюць з Балтыйскага мора. Чакаецца воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег. На дарогах месцамі ўтворыцца галалёдзіца. Вецер паўднёва-заходні, заходні ўмераны. Тэмпература паветра мінімальная ноччу складзе ад нуля да 6 марозу, а максімальная днём будзе вагацца ад мінус трох да плюс трох градусаў.

У нядзелю да суцэльнага галалёду дадасца яшчэ і паніжэнне тэмпературы паветра. У гэты дзень умовы надвор'я нашай краіны будзе вызначаць вобласць паніжанага атмасфернага ціску, якія сфарміраваны ў халоднай вільготнай паветранай масе. Чакаецца воблачна з праясненнямі. Месцамі пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег, ноччу і раніцай — слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Вецер ноччу няўстойлівы, днём па паўднёвым усходзе парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ў асноўным складзе 1–8 градусаў ніжэй за нуль, па паўночным усходзе пры праясненнях маразы ўзмоцняцца да мінус 10 градусаў. Днём таксама будзе нясоладка — максімальная тэмпература чакаецца ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдзе снег. Па ўсходзе краіны — моцны снег, у асобных раёнах мяцеліца і ўзмацненне ветру парывамі да 15–20 м/с. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 4 да мінус 10 градусаў. Пры праясненнях чакаецца да мінус 13 градусаў, а днём — ад мінус 1 да мінус 8 градусаў.

І ў аўторак часам будзе ісці снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы паветра астудзіцца да мінус 5–12 градусаў, а пры праясненнях да мінус 15 градусаў. Днём прагназуецца 3–9 марозу.

Увага! Ноччу ў сераду ў нас ударацъ, лічы, лютаўскія маразы. У гэты дзень месцамі па краіне чакаецца кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы сіноптыкі абяцаюць мінус 6–13 градусаў, а пры праясненнях — да мінус 18 градусаў. Днём слупкі тэрмометраў пакажуць мінус 1–8 градусаў, а месцамі — да мінус 11 градусаў.

ДАІ заклікае аўтааматараў не пакідаць свае транспартныя сродкі на праезнай частцы на працяглы час, каб не ствараць перашкоды для снегаўборачнай тэхнікі, а таксама нагадвае пра неабходнасць выконваць хуткасны рэжым, павялічваць дыстанцыю і бакавы інтэрвал, пазбягаць рэзкіх манеўраў і тармажэнняў. Пешаходам варта пераходзіць праезную частку толькі ва ўстаноўленых месцах і забяспечыць сваю бачнасць на дарогах, выкарыстоўваючы яркую вопратку і флікеры.

Вось вам і цёплы лістапад...

Сяргей КУРКАЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.52	16.59	8.07
Віцебск —	8.48	16.42	7.54
Магілёў —	8.43	16.49	8.06
Гомель —	8.32	16.53	8.21
Гродна —	9.07	17.16	8.09
Брэст —	9.00	17.23	8.23

Месяц

Першая квадра 20 лістапада.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Сцепаніды, Вікенція, Віктара, Лукі, Сцяпана, Фёдара.*
К. *Флоры, Эмы, Рамана, Францішка, Яна.*

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

24 ЛІСТАПАДА

У краіне

1778 год — С. Зорыч заснаваў Шклоўскае высакароднае вучылішча для дзяцей збяднелай шляхты, сярэднюю ваенную навучальную ўстанову ў Беларусі, куды прымаліся хлопчыкі з васьмі гадоў. У 1783 г. у вучылішчы было 50, у 1789-м — больш за 200 выхаванцаў. У 1785 г. адбыўся першы выпуск. З канца 1780-х гг. штогод выпускалася каля 20 чалавек. Выкладаліся: Закон Божы, матэматыка, мовы, гісторыя, геаграфія, маляванне; у 5 класе дадаткова — артылерыя, тактыка, ваенная і грамадзянская архітэктура. У 3–5 класах выхаванцы асвойвалі ваенныя практыкаванні, фехтаванне, танцы, верхавую язду, наведвалі музычныя заняткі. Навучанне насіла ваенізаваны характар. З ліку навучэнцаў былі сфарміраваны эскадрон кавалерыі і тры пяхотныя роты (дзве грэнадзёрскія і адна егерская). У вучылішчы меліся бібліятэка, музей, карцінная галерэя, аркестр, тэатр з балетнай трупай; дзейнічалі шпіталь і музычная каманда. З 28 сакавіка 1799 года перайменавана ў Шклоўскі кадэцкі корпус.

1943 год — нарадзіўся Віктар Аляксандравіч Сідзяк, беларускі спартсмен (фехтаванне на шаблях), заслужаны майстар спорту СССР. Чэмпіён (1968, 1976, 1980) і сярэбраны прызёр (1972) Алімпійскіх гульняў у камандным заліку. Чэмпіён (1972) і бронзавы прызёр (1976) Алімпійскіх гульняў у асабістым заліку. Чэмпіён (1969–1971, 1974–1975, 1979) і сярэбраны прызёр (1973) чэмпіянатаў свету ў камандным заліку.

У свеце

1859 год — Чарльз Дарвін публікуе сваю кнігу «Паходжанне відаў шляхам натуральнага адбору, або Захаванне спрыяльных парод у барацьбе за жыццё». Першае выданне кнігі разыходзіцца за адзін дзень.

1872 год — нарадзіўся Георгій Чычэрын, рускі рэвалюцыянер, савецкі дыпламат, наркам замежных спраў.

1905 год — пачатак Севастопальскага паўстання маракоў на чале з лейтэнантам Пятром Пятровічам Шмітам. Раніцай на ўсіх караблях паўстанцаў былі ўзняты чырвоныя флагі. Каб прыцягнуць на бок паўстанцаў усю эскадру, Шміт абышоў яе на мінаносцы «Свирепый», а затым накіраваўся да пераўтворанага ў турму транспарту «Прут». Узброены атрад матросаў на чале са Шмітам вызваліў пацёмкінцаў, якія знаходзіліся на судне. Да паўстанцаў далучылася каманда «Панцеляймона» (былы «Пацёмкін»). Не атрымаўшы адказу на ўльтыматум, верныя ўраду войскі пачалі абстрэл караблёў, якія паўсталі. Пасля пачатку абстрэлу мінаносец «Свирепый» распачаў адчайную, але беспаспяховую спробу атакаваць урадавыя караблі «Расціслаў» і «Церэц», але быў падпалены і выведзены са строю. У Паўднёвай бухце быў затоплены камандай мінны загараджальнік «Буг». З караблёў урадавай эскадры пашкоджанні атрымаў толькі крэйсер «Памяць Меркурыя». Пасля двухгадзіннага бою паўстанцы здаліся.

1938 год — нарадзілася Наталля Леанідаўна Крачкоўская, расійская актрыса, заслужаная артыстка РСФСР. Здымалася ў фільмах «Дванаццаць крэслаў», «Іван Васільевіч мяняе прафесію», «Будзьце маім мужам», «Пакроўскія вароты» і многіх іншых.

Так гаварыў...

МІГЕЛЬ СЕРВАНТЭС:

«У няшчасці лёс заўжды пакідае дзверцы для выхаду».

УСМІХНЕМСЯ

— Ты ж казаў, што табе трыццаць з паловай гадоў!

— Усё так, 30 з паловай, усяго 45. Матэматыку вучыць трэба было!

— Вы хацелі б пражыць мільён гадоў?

— Усяго ці яшчэ?

— Здзіві мяне за дзве хвіліны, і я выпішу табе прэмію ў гэтым месяцы.

— Мне не патрэбна прэмія, дзякуй.

Пацыент прачынаецца пасля аперацыі на сэрцы і са здзіўленнем выяўляе, што ляжыць у калідоры.

— Чаму я не ў палаце? — пытаецца ён.

— Разумееце, — адказвае медсястра, — за вокнамі палаты цяпер гарыць сухая трава і пажарныя тушаць полымя. Мы не хацелі б, каб вы падумалі, што аперацыя не ўдалася...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 10.416. Індэкс 63850. Зак. № 2637. Нумар падпісаны ў 19.30 23 лістапада 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12